# *§ 56–57–0. Прэзідэнцкая рэспубліка — гістарычны выбар беларускага народа

ПРЭЗІДЭНТ КАНСТЫТУЦЫЯ
КАБІНЕТ МІНІСТРАЎ
ВЯРХОЎНЫ САВЕТ
ПАРЛАМЕНЦКАЯ РЭСПУБЛІКА
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ РЭСПУБЛІКА
УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Першы рэспубліканскі рэферэндум

**Рэферэндум** — народнае галасаванне з мэтай выяўлення грамадскай думкі для прыняцця рашэння па якім-небудзь важным дзяржаўным пытанні.

**1. Рэферэндум 1995 г.** У Рэспубліцы Беларусь з 1994 г. фарміравалася мадэль улады, пры якой народ рэалізуе сваю функцыю крыніцы дзяржаўнай улады шляхам прамога волевыяўлення. Выкарыстанне ў Рэспубліцы Беларусь такой формы волевыяўлення народа, як **рэферэндум**, сведчыць пра дэмакратычны характар беларускай дзяржавы.

Першы ў гісторыі суверэннай Беларусі рэспубліканскі рэферэндум адбыўся **14 мая 1995 г.**, у ім узялі ўдзел 64,8 % грамадзян, якія валодалі выбарчым правам. Кіраўнік дзяржавы вынес на народнае галасаванне чатыры пытанні, што мелі важнае значэнне для далейшага развіцця маладой суверэннай дзяржавы: наконт статусу рускай мовы, дзяржаўнай сімволікі, эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, магчымасці датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі.

Беларусы падтрымалі стратэгію Прэзідэнта і яго курс на стабільнасць, парадак і адказнасць.

## ВЫНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ 14 мая 1995 г.

| | |
|---|---|
| Ці згодны Вы з наданнем рускай мове роўнага статусу з беларускай? | «Так» — 83,3 % |
| Ці падтрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь? | «Так» — 75,1 % |
| Ці падтрымліваеце Вы дзеянні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй? | «Так» — 83,3 % |
| Ці згодныя Вы з неабходнасцю ўнясення змен у дзеючую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі? | «Так» — 77,7 % |

### Новыя дзяржаўныя сімвалы

Згодна з вынікамі рэферэндуму Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падпісаў указы «Аб зацвярджэнні эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Палажэння аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь» і «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь». Так былі прынятыя дзяржаўныя сімвалы краіны, якія дзейнічаюць сёння.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь*




*Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь*

1. *Якое значэнне маюць чырвоны, зялёны і белы колеры Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь? Што сімвалізуе арнамент?*
2. *Што сімвалізуюць асноўныя элементы Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь: контур Беларусі, вянок з залатога калосся, кветак ільну і канюшыны; зямны шар, узыходзячае сонца, зорка?*
3. *Параўнайце дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь і БССР. У чым заключаецца іх пераемнасць?*

Палітыка-прававы статус інстытута прэзідэнцтва

**2. Гістарычнае значэнне рэферэндуму 1996 г.** Інстытут прэзідэнцтва, які ўвяла Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г., падкрэсліваў незалежны і суверэнны характар краіны. У адпаведнасці з Канстытуцыяй 1994 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляўся Кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.

Аднак у Канстытуцыі 1994 г. палітыка-прававы статус інстытута прэзідэнцтва не быў дастаткова прапрацаваны, адсутнічаў прававы механізм узаемадзеяння Прэзідэнта і іншых уладных структур, у першую чаргу Вярхоўнага Савета. Апошні валодаў значна большымі паўнамоцтвамі.

Рэферэндум 1996 г.

Дзейнасць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі, які атрымаў падтрымку народа падчас прамых выбараў, сутыкнулася з процідзеяннем з боку Вярхоўнага Савета. Гэта тлумачыцца тым, што падчас палітычнага крызісу першай паловы 1990-х гг. у Вярхоўны Савет трапіла шмат дэпутатаў-папулістаў, некаторыя з іх прытрымліваліся крайніх нацыяналістычных поглядаў.

Для вырашэння рознагалоссяў паміж выканаўчай (Прэзідэнт) і заканадаўчай (Вярхоўны Савет) галінамі ўлады Прэзідэнт звярнуўся да беларускага народа як крыніцы дзяржаўнай улады і ініцыяваў правядзенне ў лістападзе 1996 г. рэспубліканскага рэферэндуму.

На рэферэндум акрамя іншых пытанняў былі вынесеныя два праекты новай рэдакцыі Канстытуцыі. Адзін варыянт быў прапанаваны Прэзідэнтам і прадугледжваў рэфармаванне ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады і пашырэнне паўнамоцтваў Прэзідэнта. Другі варыянт быў распрацаваны групай дэпутатаў Вярхоўнага Савета і прапаноўваў адмену пасады Прэзідэнта і вяршэнства Парламента. Пазіцыя дэпутатаў Вярхоўнага Савета наконт адмены пасады Прэзідэнта супярэчыла Канстытуцыі, якую яны ж і прынялі ў 1994 г.

## ВЫНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РЭФЕРЭНДУМУ 24 лістапада 1996 г.

| | |
|---|---|
| Перанесці Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне | **«Так» — 88,18 %** |
| Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 г. са зменненнямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам | **«Так» — 70,45 %** |
| Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі? | **«Не» — 82,88 %** |
| Ці падтрымліваеце Вы адмену смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь? | **«Не» — 80,44 %** |

**Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г.**

**24 лістапада 1996 г.** адбыўся другі рэспубліканскі рэферэндум. У галасаванні ўзялі ўдзел 84,14 % грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодалі выбарчым правам.

**Стварэнне Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Пасля прыняцця на рэспубліканскім рэферэндуме прэзідэнцкай рэдакцыі Канстытуцыі ў нашай краіне быў створаны двухпалатны Парламент — *Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.*

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — 5 гадоў

**Савет Рэспублікі**

Складаецца з 64 членаў, 56 з іх выбіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска, 8 членаў прызначае Прэзідэнт

Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 гадоў і жыве на тэрыторыі адпаведнай вобласці, г. Мінска не менш за пяць гадоў

Рашэнні палат лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага складу палат

**Палата прадстаўнікоў**

Складаецца са 110 дэпутатаў, якія абіраюцца насельніцтвам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права тайным галасаваннем

Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Абраная мадэль кіравання краінай — **прэзідэнцкая рэспубліка** — аптымальная для беларускага грамадства з улікам гістарычных традыцый і геапалітычнага становішча.

За гады суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і прэзідэнцкай сістэмы праўлення выбудавана нацыянальная мадэль дэмакратыі, шчыльна звязаная са стваральнай і валявой асобай Прэзідэнта, мэтанакіраванай дзейнасцю народа, яго эліты, структур і ўстаноў улады.

1. *Як вы лічыце, якія гістарычныя традыцыі беларускага народа прадвызначылі выбар прэзідэнцкай рэспублікі як формы праўлення?*
2. *Як геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь магло паўплываць на выбар у якасці мадэлі кіравання краінай прэзідэнцкай рэспублікі?*
3. *Вызначце элементы (прыкметы) нацыянальнай мадэлі дэмакратыі, якая сфарміравалася ў Рэспубліцы Беларусь.*

Галоўная функцыя Парламента — прыняцце законаў. Эфектыўнасць гэтай дзейнасці забяспечваюць пастаянныя камісіі, якія фарміруюцца з дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Усякі законапраект спачатку разглядаюць у Палаце прадстаўнікоў, а пасля ў Савеце Рэспублікі. Ён робіцца законам пасля прыняцця ніжняй і ўхвалення верхняй палатамі Парламента.

Асаблівую ролю ў вызначэнні прынцыпаў працы Нацыянальнага сходу выконвае Кіраўнік дзяржавы — яго рэгулярныя сустрэчы з дэпутатамі сталі вызначальнымі ў развіцці беларускага парламентарызму.

**Прэзідэнцкая рэспубліка** — форма дзяржаўнага праўлення, якая характарызуецца значнай роляй Прэзідэнта ў сістэме дзяржаўных органаў.

Змены і дапаўненні ў Канстытуцыю 1994 г., унесеныя па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 1996 г., сведчылі пра канчатковае змяненне формы праўлення ў Рэспубліцы Беларусь з парламенцкай рэспублікі на **прэзідэнцкую**.

**Месца Прэзідэнта ў сістэме дзяржаўнага кіравання**

**3. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Паўнамоцтвы, функцыі і дзейнасць.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь займае асаблівае месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Пасля рэферэндуму 1996 г. Прэ-

**Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь ПАВОДЛЕ НАРАДЖЭННЯ:**

- не маладзейшы за 40 гадоў;
- які валодае выбарчым правам;
- які стала жыве ў Рэспубліцы Беларусь не менш за 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі;
- які не мае і не меў раней грамадзянства замежнай дзяржавы або пасведчання на права пражывання ці іншага дакумента замежнай дзяржавы, што дае права на льготы і іншыя перавагі

зідэнт з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, сімвалізуе адзінства беларускага народа, гарантуе рэалізацыю асноўных кірункаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе краіну ў адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі, падпісвае міжнародныя дамовы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь як Кіраўнік дзяржавы арганізацыйна не ўваходзіць ні ў адну галіну ўлады, а выступае арбітрам паміж рознымі палітычнымі сіламі. Прэзідэнт закліканы аб'ядналь усе ўлады і спрыяць іх эфектыўнаму функцыянаванню.

### Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Паўнамоцтвы Прэзідэнта шырокія і датычацца ўсіх кірункаў арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнай улады: рэалізацыя выканаўчай улады, удзел у заканадаўчым працэсе, фарміраванне судовай сістэмы і дзяржаўнага апарату.

Прэзідэнт робіць захады па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць. Прэзідэнт фарміруе і ўзначальвае Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца галоўнакамандуючым Узброеных Сіл. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь замацаваныя ў арт. 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт валодае недатыкальнасцю, яго гонар і годнасць абаронены законам.

### Лідар беларускага народа

Інстытут прэзідэнцкай улады трывала ўвайшоў у палітычную сістэму Беларусі, зрабіўся найважнейшай часткай беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі. Прэзідэнцкая рэспубліка ў нашай краіне — гэта мадэль улады, дзе ёсць лідар, дзяржаўны дзеяч, які здолеў закласці трывалы падмурак у справе пабудовы суверэннай і незалежнай дзяржа-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка*

*«Здольнасць лідара глыбока асэнсоўваць маштабныя праекты, валявая настойлівасць пры іх вырашэнні, мужнае ўспрыняцце калізій, якія паўстаюць, згуртоўваюць людзей, вакол яго фарміруецца стрыжань нацыі, пад яго кіраўніцтвам краіна набірае сілу і ўпэўнена займае годнае месца ў сусветнай супольнасці»* (з кнігі «Наш прэзідэнт»).

Да найважнейшых («прарыўных») рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, што вызначылі эфектыўнае развіццё сучаснай Беларусі, вучоныя адносяць:

- рашэнне аб неабходнасці максімальна захаваць эканоміку Беларусі, якая дасталася нам ад Савецкага Саюза, і на яе базе ўжо ў незалежнай краіне развіваць прамысловы патэнцыял, сельскую гаспадарку, сферу паслуг;
- захаванне калектыўных гаспадарак; прыняцце Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі; стварэнне аграгарадкоў;
- падтрымку вытворчасці высокатэхналагічных вырабаў: касмічнай і камп'ютарнай тэхнікі, аптычных вырабаў, лятальных апаратаў;
- фарміраванне энергетычнай незалежнасці рэспублікі;
- падтрымку фундаментальных і прыкладных даследаванняў, развіццё акадэмічнай, універсітэцкай і галіновай навукі, навуковых даследаванняў у галіне космасу;
- сістэмны клопат пра сем'і, маці, дзяцей;
- захаванне гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа і інш.

*1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія менавіта дзеянні Прэзідэнта сталі за кожным «прарыўным» рашэннем.*
*2. Якое з пералічаных вышэй рашэнняў Прэзідэнта, на ваш погляд, з'яўляецца самым значным? Сваю думку абгрунтуйце.*

вы, забяспечыць паспяховае сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, зрабіць яе пазнавальнай і аўтарытэтнай удзельніцай міжнародных працэсаў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка — не толькі юрыдычны, але і фактычны лідар беларускай дзяржавы, які карыстаецца вялікай падтрымкай насельніцтва краіны.




**Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г.**

**4. Рэферэндумы 2004 і 2022 гг.** На рэспубліканскім рэферэндуме 17 кастрычніка 2004 г. на разгляд беларускага народа было вынесена адно пытанне: «Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: „Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні“?» У такой фармулёўцы артыкул 81 дазваляў абірацца на пасаду Прэзідэнта без абмежавання колькасці тэрмінаў.

У галасаванні ўзяло ўдзел 90,28 % выбаршчыкаў. З іх 87,97 % выказаліся ў падтрымку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

Пасля 2004 г. Прэзідэнт неаднаразова ўзнімаў пытанне наконт новай канстытуцыйнай рэформы, тлумачачы сваю ініцыятыву патрабаваннямі часу. Найбольш грунтоўна яна была анансаваная Кіраўніком дзяржавы падчас спробы дзяржаўнага перавароту 2020 г. Адным з галоўных пасылаў Прэзідэнта была рэалізацыя прынцыпу прамой нарады з народам шляхам рэферэндуму і склікання прадстаўнічага сходу.

На VI Усебеларускім народным сходзе (люты 2021 г.) была прынятая рэзалюцыя аб правядзенні канстытуцыйнай рэформы.

**Канстытуцыйная рэформа**

Створаная Канстытуцыйная камісія распрацавала прапановы па змяненні Канстытуцыі і забяспечыла іх усенароднае абмеркаванне. Было праведзена абмеркаванне прапаноў ва ўсіх працоўных калектывах, кожны грамадзянін Беларусі меў магчымасць выказаць сваю думку. Па праекце новай Канстытуцыі паступіла амаль 5 тыс. водгукаў і прапаноў.

**Рэспубліканскі рэферэндум 27 лютага 2022 г.**

**27 лютага 2022 г.** адбыўся чацвёрты рэспубліканскі рэферэндум, дзе на абмеркаванне было вынесена адно пытанне: «Ці прымаеце Вы змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?». Удзел у рэферэндуме прынялі 78,63 % грамадзян, якія валодалі выбарчым правам. Станоўча адказалі 82,86 % удзельнікаў.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь былі скарэктаваныя прэамбула і 85 артыкулаў, з'явілася 11 новых артыкулаў, выключаны два. Асноўны Закон дапоўнены раздзелам 3 «Усебеларускі народны сход». У адказ на выклікі сучаснага грамадства ў Канстытуцыі замацаваныя абарона гістарычнай памяці пра подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і абарона традыцыйнага інстытута сям'і як саюзу жанчыны і мужчыны.

Новая рэдакцыя Асноўнага Закона зрабілася яшчэ адным крокам да ўмацавання суверэнітэту дзяржавы. Яна грунтуецца на найважнейшых прын-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, унесеныя па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 2022 г., замацавалі каштоўнасныя арыенціры беларускага грамадства.

- **Імкненне вырашаць найважнейшыя пытанні калектыўна.** Гэтая традыцыя бярэ пачатак ад народных сходаў — веча ў Полацкім княстве.
- **Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці.** Трывалая сям'я — аснова моцнай дзяржавы.
- **Здароўе беларускай нацыі** — гэта залог яе ўстойлівага развіцця і росквіту.
- **Узаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы.**
- **Захаванне памяці пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, гераізм і самаадданасць беларускага народа.**

1. *У якіх артыкулах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь знайшлі адлюстраванне пералічаныя каштоўнасці беларускага грамадства?*
2. *«Наша Канстытуцыя дае магчымасць годна жыць, развівацца, адчуваць сябе ў бяспецы, рэалізаваць самыя смелыя планы і пачынанні на роднай зямлі. Так і мае быць у сучаснай дэмакратычнай, па-сапраўднаму дэмакратычнай краіне» (А. Р. Лукашэнка). Абапіраючыся на тэкст Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прывядзіце 2–3 аргументы, якія пацвярджаюць гэтае выказванне.*

цыпах: вяршэнства права, гарантыя правоў чалавека і грамадзяніна, суверэннае права беларускага народа самастойна вызначаць свой лёс і быць паўнапраўным суб'ектам сусветнай супольнасці. Новая рэдакцыя Канстытуцыі — гэта адказ на спробы замаху на дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь з боку заходніх дзяржаў, якія праводзяць санкцыйную палітыку, намагаюцца актыўна ўмяшацца ў ход электаральных працэсаў, а таксама робяць іншыя захады негатыўнага ўздзеяння на нашу краіну з мэтай падпарадкавання сваім інтарэсам.

**Усебеларускі народны сход**

**5. Усебеларускі народны сход.** Упершыню Усебеларускі народны сход быў скліканы ў кастрычніку 1996 г. Дэлегатамі сходу былі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны і розных сацыяльных груп, прафесій і ўзростаў. Дэлегаты ўзялі ўдзел у абмеркаванні

першай 5-гадовай Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 1996–2000 гг. Кіраўнік дзяржавы А. Р. Лукашэнка прадставіў далейшую стратэгію развіцця краіны з акцэнтам на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. На сходзе ўпершыню шырока абмяркоўваўся і праект змен у Канстытуцыю, вынесены пазней на рэспубліканскі рэферэндум. Назва даклада Прэзідэнта «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс» зрабілася дэвізам сходу і замацавала стратэгію далейшай дзейнасці Кіраўніка дзяржавы і грамадска-палітычнага развіцця беларускага грамадства.

Пасля 1996 г. Усебеларускі народны сход праводзіўся рэгулярна. На Усебеларускіх народных сходах, якія праходзілі ў 2001, 2006, 2010, 2016, 2021 гг., пазначаліся арыенціры і прыярытэты дзяржавы, зацвярджаліся праграмы развіцця нашай краіны на наступныя пяць гадоў. Лозунгі, пад якімі праходзіў Усебеларускі народны сход, вызна-

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З даклада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс»**

«Менавіта на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі нацэленая Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі да 2000 года… Некаторыя яе палажэнні могуць не задавальняць Урад, дзелавыя колы, прамыслоўцаў і г. д. Галоўнае ў тым, што яна задавальняе народ у цэлым і здольная стаць падмуркам кансалідацыі ўсіх пластоў грамадства. Гарантам выканання праграмы з'яўляецца Кіраўнік дзяржавы».

1. *Што такое сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка? У інтарэсах якіх колаў грамадства яна рэалізуецца?*
2. *Што Кіраўнік дзяржавы лічыў галоўным крытэрыем ацэнкі Праграмы развіцця рэспублікі да 2000 г.?*
3. *Як вы лічыце, чаму сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка можа стаць падмуркам кансалідацыі ўсіх пластоў грамадства?*

чалі сэнс і асноўныя кірункі маючых адбыцца пераўтварэнняў:

- *2001 г. «За моцную і квітнеючую Беларусь»;*
- *2006 г. «Дзяржава для народа»;*
- *2010 г. «Наш гістарычны выбар — незалежная, моцная і квітнеючая Беларусь»;*
- *2016 г. «Разам — за моцную квітнеючую Беларусь!».*

VI Усебеларускі народны сход праходзіў у складаных грамадска-палітычных умовах, якія былі выкліканыя спробай дзяржаўнага перавароту ў 2020 г. Ён адбыўся ў лютым 2021 г. пад лозунгам *«Адзінства! Развіццё! Незалежнасць!»*. На шматлікіх пляцоўках абмяркоўваліся актуальныя для Рэспублікі Беларусь пытанні: стабільнасць у грамадстве, рост дабрабыту грамадзян, мадэрнізацыя эканомікі, пераход да новага тэхналагічнага ўкладу, павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі, стварэнне камфортных умоў для жыцця, працы і самарэалізацыі чалавека. У выніку было прынятае рашэнне аб неабходнасці ўнясення змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

**Змяненне статусу Усебеларускага народнага сходу**

Згодна са зменамі і дапаўненнямі, унесенымі ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 27 лютага 2022 г., статус Усебеларускага народнага сходу змяніўся — ён зрабіўся канстытуцыйным органам. Былі сфармуляваныя нормы, што вызначылі яго статус, парадак фарміравання і паўнамоцтвы.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, прынятай у 2022 г., *Усебеларускі народны сход* — вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы і забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (2022 г.)**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца:

- Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;
- Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў у сувязі з заканчэннем тэрміну яго знаходжання на пасадзе або датэрмінова ў выніку яго адстаўкі;
- прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;
- прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў;
- прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.

Прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці на Усебеларускі народны сход абіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска ў парадку, вызначаным законам.

Найбольшая колькасць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу складае 1200 чалавек.

Тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу складае пяць гадоў.

1. *Хто можа быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу?*
2. *Абапіраючыся на артыкул Канстытуцыі, аргументуйце меркаванне: «Усебеларускі народны сход — інстытут дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь».*
3. *Дакажыце, што дэлегаты Усебеларускага народнага сходу прадстаўляюць усё беларускае грамадства.*

Усебеларускі народны сход:

- зацвярджае асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;
- дае абавязковыя для выканання даручэнні дзяржаўным органам і службовым асобам, атрымлівае інфармацыю ад дзяржаўных органаў і службовых асоб;
- заслухоўвае справаздачу Прэм'ер-міністра аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;
- усталёўвае дзяржаўныя святы і святочныя дні;
- ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, устаноўленыя Канстытуцыяй і законам.

**Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу**

Перыядычнасць пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу — не радзей чым адзін раз на год. У перыяд паміж пасяджэннямі аператыўнае вырашэнне пытанняў забяспечваецца Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу.

Усебеларускі народны сход стаіць вышэй за ўсе галіны ўлады. Ён прымае рашэнні, якія з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам дзяржаўнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў.

**VII Усебеларускі народны сход**

У красавіку 2024 г. адбылося пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу ў новым канстытуцыйным статусе. Яно прайшло пад лозунгам *«Час выбраў нас!»*. Падчас работы дэлегатамі быў абраны Старшыня Усебеларускага народнага сходу — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, намеснікам Старшыні — А. М. Касінец, а таксама пастаянна дзеючы Прэзідыум у складзе 13 чалавек.

Дэлегаты зацвердзілі *Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь* і *Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь* — асноватворныя дакументы, якія рэгламентуюць падыходы да забеспячэння ўласнай бяспекі ў розных сферах з улікам геапалітычных змен у свеце.




Усебеларускі народны сход — нацыянальная форма беларускага народаўладдзя, наша ўнікальная мадэль развіцця грамадзянскай супольнасці. Яна аформілася ў суверэннай Беларусі, але заснаваная на векавых традыцыях народаўладдзя беларускага народа. Усебеларускі народны сход у XXI ст. даказаў сваю эфектыўнасць і запатрабаванасць грамадствам. Ён паляпшае ўзаемадзеянне паміж дзяржавай і грамадствам, дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп.

*За гады незалежнасці ў Рэспубліцы Беларусь пабудаваная нацыянальная мадэль дэмакратыі, якая спалучае ў сабе прэзідэнцкую рэспубліку як форму праўлення і прамы ўдзел беларускага народа ў прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў. Інстытут прэзідэнцтва дазволіў зрабіць дзяржаўны суверэнітэт Беларусі рэальным. Знешняя і ўнутраная палітыка краіны вызначаецца Канстытуцыяй, а не чужымі дырэктывамі. Рэспубліка Беларусь сёння — у поўным сэнсе нацыянальная незалежная дзяржава. Усебеларускі народны сход — унікальная форма народаўладдзя. Ён дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 1994 г. — правядзенне рэферэндуму ў Кыргызстане. Амаль 90 % тых, хто прагаласаваў, падтрымалі ўмацаванне ўлады Прэзідэнта і стварэнне двухпалатнага парламента | 1994 г. — абранне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 1995 г. Якое значэнне яны мелі для ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і прэзідэнцкай улады?
2. Чым была абумоўленая трансфармацыя Рэспублікі Беларусь з парламенцкай у прэзідэнцкую рэспубліку?
3. Канкрэтызуйце фактамі вывад: «Прэзідэнцкая рэспубліка — гістарычны выбар беларускага народа».
4. Ахарактарызуйце ролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сістэме дзяржаўнага кіравання.
5. Канкрэтызуйце фактамі вывад: «Рэспубліканскія рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь паспрыялі ўмацаванню сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве і дзяржаве».
6. Ахарактарызуйце месца Усебеларускага народнага сходу ў грамадска-палітычным жыцці суверэннай Рэспублікі Беларусь. Як змяніўся яго статус у 2022 г.? Пацвердзіце прыкладамі вывад: «Усебеларускі народны сход дазваляе максімальна ўлічваць баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп».